# ДАБРАЧЫННЫЯ ЭКСКУРСІІ

# CHARITABLE EXCURSIONS



## ВАНДРОЎКА Ў ЖЫРОВІЦКІ МАНАСТЫР

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, Вялікодная радасць зноў напоўніла душы і сэрцы выхаванцаў школы-інтэрната № 7 для дзяцей-сірот г. Мінска 17 красавіка 2010 года. Ласкаю Божай і дзякуючы Міжнароднай дабрачыннай арганізацыі "Этнічныя галасы Амерыкі" адбылася духоўная вандроўка ў Жыровіцкі манастыр.

Калі мы прыехалі ў манастыр, надвор'е значна змянілася: ярка свяціла сонейка, саграваючы нас сваімі пяшчотнымі праменьчыкамі. Пад купаламі статнага Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра панавала таямнічая ўрачыстасць, незвычайная любоў, радасць, якая адразу ж адлюстравалася на тварах і ў душах нашых дзяцей. Дзякуючы экскурсаводу-семінарысту мы наведалі Крыжаўзвіжанскую царкву, званіцу манастыра, Яўлінскую царкву і даведаліся многа цікавага і карыснага.

## A TRIP TO THE ZHYROVICHY MONASTERY

Despite bad weather, the Easter joy filled again the souls and hearts of pupils of boarding school №7 for orphan children in Minsk on 17 April 2010. Thanks to God and the international charitable organization "Ethnic Voice of America", we had a spiritual trip to the Zhyrovichy Monastery.

When we arrived at the Monastery, the weather changed considerably - the sun was shining brightly, warming us with its gentle rays. Under the domes of the Zhyrovichy Assumption Church, there was mysterious solemnity, unusual love, and gladness that conquered at once the faces and souls of our children. Thanks to our guide-seminarian, we visited the Church of the Exaltation of the Holy Cross, the monastery belltower, the Epiphany Church, and learned a lot of interesting and useful things.

With excitement and especial tenderness, children venerated the icon of Holy Mother and other icons with prayers and gratitude. During

З хваляваннем і асаблівым замілаваннем дзеці прыкладваліся да абраза Божай Маці і іншых ікон з малітваю і падзякай. І ў гэты момант усе думкі, пачуцці і вочы дзяцей, здавалася, асвечваліся незямным святлом, душа напаўнялася мірам.
Па заканчэнні экскурсіі мы нас акружылі ўвагай і любоўю ў трапезнай, дзе з апетытам елі смачную манастырскую вараную капусту, кашу і пілі гарбату. Затым, з блаславення бацюшкі, мы накіраваліся да Святой крыніцы, якая цудадзейнай сілай умацавала і абнавіла наш фізічны і духоўны стан.  Свята душы адбылося! Настрой быў радасны, не хацелася ад'язджаць.

Мы ўсе, выхаванцы і педагогі, вельмі ўдзячныя Міжнароднай дабрачыннай арганізацыі "Этнічныя галасы Амерыкі" і асабіста Вярбоўскай Наталлі Міхайлаўне за гэтую цудоўную вандроўку, пра якую будзем доўга ўспамінаць. Як ежа і адпачынак неабходныя чалавеку для падтрымкі яго фізічнага жыцця, а веды, мастацтва і культура ўзбагачаюць душэўныя якасці, так і сутыкненне са святыняй раскрывае ў чалавеку вышэйшы духоўны бок яго сутнасці.

***Выхаванцы школы-інтэрната № 7***
***("Этнічны голас Амерыкі", 2010 г.)***

this moment, it seemed that all thoughts, feelings, and eyes of the children were illuminated by the unearthly light, while their souls were filled with peace.

After the excursion was over, we were surrounded with attention and love in the refectory where we ate with appetite the tasty monastic cooked cabbage and porridge and had tea. Then, with the father's blessing, we went to the sacred spring which miraculous force strengthened and vitalized our physical and spiritual condition.

It was a fête of the soul! The mood was joyful; we did not want to leave.
All of us, both pupils and teachers, were very grateful to the international charitable fund "Ethnic Voice of America" and especially Natalia M. Viarbouskaya for this wonderful trip that we will remember for good.
Like meal and rest are necessary for people to support their physical life, while knowledge, arts, and culture enrich soul qualities, visits to sacred places reveal in people the higher spiritual sides of their essence.

***Pupils of boarding school №7***
***(Ethnic Voice of America, 2010)***

























